## Народ. Прэзідэнт. Урад

### 20 ГАДОЎ СУПРАЦОЎНІЦТВА

“Умацаванне шматпланавых сувязей з Вялікім Кітаем з’яўляецца адным з прыярытэтных напрамкаў знешняй палітыкі беларускай дзяржавы, - падкрэсліў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка. - На фундаменце традыцыйнай дружбы нашых народаў за мінулыя два дзесяцігоддзі мы выбудавалі цеснае стратэгічнае партнёрства”.

Нашы краіны пачалі рэалізацыю маштабных інвестыцыйных праектаў, уключаючы стварэнне сумесных прадпрыемстваў у Кітаі і Беларусі, запусцілі механізмы крэдытнага і міжбанкаўскага супрацоўніцтва.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што беларуска-кітайскае плённае ўзаемадзеянне ў галіне культуры, навукі, адукацыі пашыраецца з кожным годам, прыносячы значныя вынікі.

Прэзідэнт выказаў перакананне, што патэнцыял беларуска-кітайскага супрацоўніцтва далёка не вычарпаны. Вялікія перспектывы ёсць у развіцці крэдытна-інвестыцыйных сувязей і прамых кантактаў паміж рэгіёнамі і прадпрыемствамі дзвюх краін.

### АДЗІНЫ ГАНАРОВЫ ОРДЭН ДА 70-ГОДДЗЯ ПЕРАМОГІ Ў ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ

Дзяржавы - удзельніцы Садружнасці Незалежных Дзяржаў плануюць заснаваць адзіны Ганаровы ордэн да 70-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Норма аб стварэнні ўзнагароды прапісана ў праекце рашэння аб падрыхтоўцы да святкавання 70-й гадавіны Перамогі, які быў дапрацаваны і ўзгоднены на пасяджэнні экспертнай групы ў Мінску. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе Выканкама СНД.

Удзел у пасяджэнні прынялі эксперты з Арменіі, Беларусі, Казахстана, Кыргызстана, Расіі, Таджыкістана, Украіны.

Прадугледжваецца, што Ганаровым ордэнам “70 гадоў Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне 1941-1945 гг.” будуць узнагароджвацца непасрэдныя ўдзельнікі баявых дзеянняў.

Акрамя таго, краіны СНД выпусцяць і адзіны юбілейны медаль “70 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941-1945 гг.”.

Згодна з праектам рашэння Савет міністраў абароны дзяржаў - удзельніц Садружнасці павінен будзе падрыхтаваць і ўнесці ў 2013 годзе на разгляд кіраўнікоў дзяржаў палажэнні аб ордэне і юбілейным медалі.

У праекце рашэння таксама змяшчаюцца рэкамендацыі краінам СНД распрацаваць і прыняць нацыянальныя праграмы па падрыхтоўцы і святкаванні юбілею Перамогі. Па традыцыі ў рамках СНД будзе распрацаваны і прыняты агульны план асноўных мерапрыемстваў да 70-годдзя Перамогі.

Узгоднены экспертамі праект рашэння аб падрыхтоўцы да святкавання 70-й гадавіны Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне 1941-1945 гадоў будзе ва ўстаноўленым парадку ўнесены на разгляд Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД.

### ПРАЦОЎНЫЯ ПЕНСІІ ПАВЯЛІЧАЦЦА НА 24%

Працоўныя пенсіі ў лютым у выніку пераразліку павялічацца ў сярэднім на 24%. Гэта павышэнне адчуюць на сабе звыш 2,4 млн. чалавек. Сярэдні памер працоўнай пенсіі па ўзросце складзе прыблізна 1 млн. 252 тыс. руб.

Як заявіла намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Валянціна Каралёва, у адпаведнасці з указам №35 ад 16 студзеня 2012 года “Аб павышэнні пенсій”, пераразлікі працоўных пенсій у сувязі з ростам сярэдняй заработнай платы работнікаў у рэспубліцы ў 2012 годзе будуць ажыццяўляцца штоквартальна. Што тычыцца першага пераразліку, то ён будзе праведзены з 1 лютага, зыходзячы з сярэдняй заработнай платы работнікаў у рэспубліцы за IV квартал 2011 года (па звестках Нацстата, яна склала 2 млн. 543 тыс. руб.).

З 1 лютага таксама адбудзецца чарговы пераразлік мінімальных працоўных і сацыяльных пенсій, надбавак і павышэнняў да пенсій у сувязі са змяненнем бюджэту пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва (БПМ).

Акрамя таго, у лютым непрацуючыя пенсіянеры ва ўзросце 75 гадоў і старэй атрымаюць да пенсіі дзве дадатковыя мэтавыя даплаты: студзеньскую і лютаўскую (гэтая даплата да пенсіі будзе выплачвацца штомесяц непрацуючым пенсіянерам ва ўзросце 75 гадоў і старэйшым). Памер даплаты ў студзені складзе адпаведна 107 тыс. 770 руб. і 143 тыс. 700 руб. У далейшым гэты памер будзе карэктавацца ў залежнасці ад велічыні мінімальнага памеру пенсіі па ўзросце.

У цэлым, падкрэсліла намеснік міністра, тэмпы росту пенсій у краіне супастаўныя з тэмпамі росту заработнай платы, а суадносіны сярэдняй пенсіі па ўзросце і сярэдняй заработнай платы перавышаюць 40%.

Другі пераразлік пенсій адбудзецца з 1 мая. Пенсіі будуць пералічаны, зыходзячы з сярэдняй заработнай платы работнікаў у рэспубліцы за I квартал 2012 года.

### РЭКАНСТРУКЦЫЯ МАЛОЧНАТАВАРНЫХ ФЕРМАЎ

У Беларусі ў 2012 годзе плануецца рэканструяваць і тэхнічна перааснасціць 1198 малочнатаварных фермаў, паведамілі ў Міністэрстве сельскай гаспадаркі і харчавання.

Гэта дасць магчымасць знізіць затраты працы і павысіць эфектыўнасць вытворчасці малака, а таксама павялічыць пагалоўе кароў на 87,8 тыс. галоў. Прэзідэнт у снежні 2011 года паставіў задачу, каб кожная гаспадарка рэспублікі ў гэтым годзе за кошт уласных сродкаў рэканструявала адну малочнатаварную ферму з улікам сучасных прагрэсіўных тэхналогій утрымання, кармлення жывёлы і вытворчасці малака. Вызначаны асноўныя падыходы да выканання гэтых работ у гэтым годзе з максімальным выкарыстаннем уласных фінансавых сродкаў сельгасарганізацый і айчыннага тэхналагічнага абсталявання, якія адобраны кіраўніком дзяржавы.

У 2012 годзе таксама запланавана будаўніцтва новых 104 малочнатаварных фермаў. На гэтыя мэты ўрадам Беларусі адшуканы льготныя крэдытныя рэсурсы на Br2 трлн.

**Па матэрыялах БелТА.**

### Уточнение

В №3 за 20 января 2012 года газеты «Светлы шлях» материал под названием «Даже Польшу воротит от белорусской оппозиции» был написан нештатным автором Сергеем Шевчуком. Недоразумением оказалось, что в городе есть его тезка Сергей Шевчук, работник райисполкома, который к этой статье не имеет никакого отношения.

*ЕСТЬ МНЕНИЕ*

# Война – это лицо США

**Тихо и почти незаметно на планете окончилась очередная война, развязанная США. В Ираке был спущен американский флаг, и таким образом была поставлена точка в военном конфликте, который продолжался почти девять лет.**

«Редко, за всю человеческую историю, можно пожертвовать так много, чтобы достичь так мало», - сказал профессор Бостонского университета Эндрю Бацевич. По его словам, «ужасное наследие иракской войны выходит за рамки растраченных средств и потерянных или разбитых жизней». Поскольку теперь все оставшиеся благоразумные, нормативные и конституционные барьеры применения силы отброшены в сторону, война стала нормальным состоянием, стала чем-то, что огромное большинство американцев принимает без претензий», - приводит слова Бацевича журнал Foreign Affairs.

Всё началось в 2003 году после скандальной фальсификации, устроенной американцами в Совете Безопасности ООН. Тогда госсекретарь США Колин Пауэлл всему миру продемонстрировал пробирку, якобы содержавшую ложку спор сибирской язвы. Данный политик с пеной у рта категорично утверждал, что в Ираке тысячи таких ложек... Через полгода Багдад подвергся бомбардировкам. Споры язвы, как, впрочем, и зачатки какого-либо другого оружия массового поражения, так и не нашли, а госсекретарь всего-навсего извинился, сказав, что его, дескать, «ввели в заблуждение».

Сколько за годы войны погибло иракских граждан - точных сведений нет. Есть оценки различных экспертов. Так, Пентагон оценивает потери населения Ирака за годы войны в 60 тысяч человек. Однако согласно исследованию министерства здравоохранения Ирака, проведённому для Всемирной организации здравоохранения, жертвы мирного населения с начала войны (март 2003 года) до одного лишь июня 2006 года составили от 104000 до 223000 человек.

Нынешний Президент США Барак Обама не только сохранил, но и расширил военную политику, начатую его предшественником Джорджем Бушем. Ученик оказался достойным своего учителя. Чего только стоят его беспрецедентные милитаризированные акции по насильственному внедрению демократии в Ливии, Сирии, Египте. Теперь вот на подходе Иран. Ненасытное желание владеть всеми природными ресурсами мира лишило правительство США сдерживающего морального фактора.

В итоге иракской войны была разгромлена одна из самых развитых и технологически продвинутых стран региона, которая занимала определенную (не выгодную для США) антиизраильскую позицию. США добились осложнения отношений между шиитами и суннитами на иракской площадке за счет использования нанятых провокационных элементов.

Сегодня, уходя из Ирака, США хочет оставить его в качестве площадки для конфронтации Ирана и арабов. Ведь абсолютно ясно, что наиболее мощными игроками на территории Ирака после ухода США становятся иранцы. Нынче Тегеран практически полностью присутствует во всех аспектах иракской политики.

Если в прошлом «теория освободительных войн» и оставляла у кого-то иллюзии по поводу желаний США и методов ее «демократизации», то после событий в Ираке и в целом на Ближнем Востоке людей, верящих в идеалы Запада, не осталось. В целом американцы в Ираке добились глубочайшей ненависти к себе со стороны большинства населения. К слову, небывалый уровень ненависти по отношению к себе американцы мобилизовали не только в Ираке, а уже практически по всему миру.

**По материалам Интернет-ресурсов.**

*ДЭМАГРАФІЧНАЯ СІТУАЦЫЯ*

# Дзяўчынак больш. І жывуць жанчыны даўжэй

**Як паказвае параўнальны аналіз нараджальнасці, колькасць нованароджаных на Смаргоншчыне з кожным годам, хоць ненамнога, але прырастае. Калі да 2005 года відавочна было зніжэнне нараджальнасці, то затым год ад года лічба пачала расці. Летась, напрыклад, нарадзілася 631 дзіцятка, з якіх 102 зарэгістрыраваныя сельскімі выканкамамі. Начальнік аддзела ЗАГС райвыканкама Ірына Казакова адзначыла, што 272 нованароджаных - першынцы, астатнія з’яўляюцца другім або трэцім дзіцем у сям’і.**

Найбольш папулярныя імёны, якімі называюць смаргонскія бацькі сваіх дзяцей - Максім, Матвей, Ягор, Дар’я, Мілена, Аляксандра. Сярод рэдкіх - Эдвін, Алесь, Дамінік, Беатрыс, Ніколь, Ія. Дарэчы, за мінулы год дзяўчынак нарадзілася на 11 больш, чым хлопчыкаў.

Разам з тым, па-ранейшаму колькасць выпадкаў смерці перавышае нараджальнасць. У сельскай мясцовасці смяротнасць у пяць разоў вышэй за нараджальнасць. У 2011 годзе на Смаргоншчыне памерла 886 чалавек, што значна больш, чым у 2010 годзе. У выніку ў нашым раёне смяротнасць у 1,4 раза перабольшвае нараджальнасць. Сярод прычын смерці на першым месцы па-ранейшаму застаюцца хваробы сэрца і кровазвароту. З усіх памерлых 23 працэнты складаюць людзі працаздольнага ўзросту. Мужчын у гэтай групе памерлых значна больш.

Летась быў зарэгістраваны 601 шлюб, што на 22 працэнты больш, чым у папярэдні год. Сем пар выказалі жаданне, каб гэта цырымонія праводзілася на беларускай мове, адна рэгістрацыя шлюбу адбылася на сядзібе Францішка Багушэвіча ў Кушлянах. 29 шлюбаў зарэгістраваны нашым ЗАГСам з грамадзянамі іншых краін, пераважна з Расіі, Украіны, Літвы, але ёсць і з Ірана.

Магія лічбаў не вельмі прывабіла смаргонскіх маладажонаў, таму зарэгістраваць шлюб 11.11.11 пажадалі ўсяго толькі дзве пары, хоць у некаторых аддзелах ЗАГС рэспублікі быў у гэты дзень сапраўдны аншлаг. А наша моладзь больш разлічвае на сапраўднае пачуццё, чым на дапамогу чарадзейства.

**Ала КЛЕМЯНОК.**

*ЖЫВЁЛАГАДОЎЛЯ*

# Адкуль у лімузіна рогі?



**Карова павінна даваць малако. Многія гады ў гаспадарках гэта сцвярджэнне прымалася за аксіёму. Але час пачаў дыктаваць новыя падыходы да развядзення буйной рагатай жывёлы. У апошні час многія гаспадаркі малочнага напрамку пачалі “спрабаваць свае сілы” ў мясной жывёлагадоўлі. БРЖ “заморскіх” парод - герыфордаў і абердзіна-ангусаў - не так даўно пачалі разводзіць СВК “Ракаўцы” і СВК “Солы”. А вось у СВК “Саўбел” мясной жывёлагадоўляй займаюцца ўжо чацвёрты год. Тут вырошчваецца буйная рагатая жывёла не менш экзатычнай пароды - лімузін.**

Каровы пароды лімузін ужо даўно прапісаліся на ферме ў Абрамаўшчыне. У 2010 годзе сюды прывезлі першую партыю цялушак - лімузінаў першага пакалення. Іх атрымалі ад звычайных рагуль, якіх пакрылі семенем лімузінаў.

Цяпер на ферме, якую ўмоўна можна назваць “цэхам узнаўлення”, утрымліваецца 85 галоў. Сярод іх ужо ёсць прадстаўнікі другога пакалення лімузінаў, у якіх вельмі добра прасочваецца пароднасць. У першых лімузінаў часцей дамінавалі мяцярынскія гены, і таму большасць цялят нараджаліся чорнымі, хаця чыстакроўны прадстаўнік мае ярка-чырвоную афарбоўку тулава і светлы жывот.

Лімузмін - буйная рагатая жывёла мяснога напрамку, якая характарызуецца сваёй непераборлівасцю. У ежы яна не гурман і да халадоў таксама прыстасавана. Так што праблем з утрыманнем пакуль не ўзнікала. Праўда, былі некаторыя цяжкасці, калі ў звычайных рагуль нараджалася першае пакаленне. Цяляты мелі дастаткова вялікую вагу – 30-35 кг, а таму работнікам фермы прыходзілася вельмі ўважліва сачыць за кожным расцёлам.

Цяпер у СВК “Саўбел” займаюцца нарошчваннем матачнага пагалоўя. Цёлак пакідаюць для ўзнаўлення, а бычкоў, якія дасягнулі шасцімесячнага ўзросту, забіраюць ад маці і пераводзяць на дарошчванне. Цяпер у гаспадарцы ўжо амаль 200 лімузінаў, а будзе яшчэ больш.



“Гаспадыня” лімузінаў Тэрэса АНДРЫЦА.

**Таццяна ЧАРНЯЎСКАЯ.**
**Фота Міхаіла РАЗУМНІКА.**

■ ПРАВОСЛАВНЫЙ ФЕСТИВАЛЬ

# Слава в вышних Богу!

**Говорят, для большинства Новый год пахнет хвоей и мандаринами. А я точно знаю, что Рождество пахнет медовым ладаном. Почему медовым? Не замечали разве, что у ладана запах меда? Лично для меня, словно мед на душу, еще и церковное пение, которое лечит, услащает, очищает.**


Мужской коллектив из Мира.


Выступает хор им. Огинского.

Невозможно представить Рождественские и Крещенские празднества без чудесных песнопений. А начало минувшей недели украсили своими выступлениями участники традиционного фестиваля церковных хоров «Слава в вышних Богу!», второй тур которого проходил в нашем городе. На сцене районного Дома культуры выступали хоры городских приходов храмов Новогрудско-Лидской епархии. Коллективы сельских приходов демонстрировали свое творчество в Ивье на следующий день. Забегая наперед, сообщу, что в Ивье успешно выступили детский хор воскресной школы нашего храма Преображения Господня и хор Светлянской Петропавловской церкви. Детский хор был сразу приглашен в Лиду для участия в гала-концерте фестиваля.

Всего во втором туре конкурса принимали участие 14 коллективов из Лиды, Новогрудка, Слонима, Березовки, Дятлова, Кореличей, Мира. От нашего района выступил хор народного коллектива песни и танца имени Михала Клеофаса Огинского. Торжественно открыли мероприятие заместитель председателя райисполкома Геннадий Бычко и протоиерей Анатолий Резанович.

Следует отметить, что на подобных фестивалях проявляется истинное мастерство хорового пения, поскольку исполняемые акапелло духовные произведения требуют от певцов исключительной чистоты звука и слаженности. Зато какое наслаждение получают слушатели, с какими просветленными лицами воспринимают эту живую, воистину духовную музыку! В репертуаре коллективов тропари, колядки, псалмы, классические и народные песнопения.

Мастерство духовного пения продемонстрировали хоры Новогрудского Борисоглебского храма, Лидского храма Всех Святых и храма Георгия Победоносца. На белорусском языке возвеличивали Богородицу участники хора храма Преображения Господня из Дятлова. Колядки по-белорусски пропели и хористы мирского храма Святой Троицы. Кстати, в составе этого коллектива нет ни одного профессионала. Как заметил настоятель храма, священник Павел Лукашевич, в этом чисто мужском коллективе поют врач-терапевт, строитель, предприниматель, учитель. Состязаться в исполнительском мастерстве с музыкантами и преподавателями лицеев, конечно же, им сложно. Вместе с тем, выступление выглядело достойно.

Думается, надолго запомнятся присутствовавшим на этом удивительном концерте песнопения хора храма святого Сергия Радонежского при Лидском погранотряде, в составе которого есть и военнообязанные. А выступление хора лидского храма «Всех святых» было подобно радостному перезвону рождественских колоколов и звоночков. На высоком уровне прозвучало выступление хора имени Огинского, который также получил приглашение на гала-концерт в Лиду.

**Алла СТРАШИНСКАЯ.**
**Фото автора.**

РЭХА ПАДЗЕІ

# "Кошык" добрага настрою

**Калі святочнымі зімовымі вечарамі вы жадаеце добра адпачываць, праявіць творчыя здольнасці, прыязджайце ў цудоўнае мястэчка Залессе, дзе стала добрай традыцыяй праводзіць "Сустрэчы на Ражство".**

13 студзеня дзверы Залескага ЦДК былі гасцінна адчынены для ўсіх, хто захацеў прыняць удзел у гэтым мерапрыемстве. А жадаючых было шмат: працаўнікі ААТ "Смаргоньлён" і "Смаргонсілікатабетон", чыгуначнікі, работнікі школы-сада і музычнай школы, ветэраны працы.

Распачалося свята песнапеннямі хора царквы Пакрова Прасвятой Багародзіцы і прамовай айца Аляксандра. А затым "калядавалі", ходзячы ад аднаго століка да другога, Гаспадар (старшыня сельсавета Зянон Грышкевіч) і Гаспадыня (дырэктар Залескага ЦДК Алена Суслава). Так званая "хатка" ААТ "Смаргоньлен" сустрэла Гаспадароў багата накрытым сталом, рэкламай страў і святочнымі пажаданнямі. Чыгуначнікі паказалі тэатралізаванае прадстаўленне "Паўночныя Афіны запрашаюць". Вершаванымі пажаданнямі аднаяскоўцам прыемна здзівіла "хатка" пенсіянераў. Добрыя ўражанні пакінулі інструментальныя выступленні настаўнікаў. А работнікі ААТ "Смаргонсілікатабетон" павесялілі ўсіх сваімі заваднымі песнямі.

На працягу ўсяго свята ладзіліся гульні і конкурсы, выступаў тэатр мініяцюр "Марыянеткі", вакальны гурт "Заляснянка" дарыў свае песні. Ледзь неслі напрыканцы калядная сустрэчы Гаспадар з Гаспадыняй кошык добрага настрою, пазітыўных эмоцый і творчага натхнення.

**Алена ПАЎЛАВА.**

■ КАЛЯДНЫЯ СУСТРЭЧЫ

# Фальклор - мудрасць народная

**20 студзеня адпаведна з народнымі паданнямі - лянівы дзень або праводзіны Калядаў. Вечарам у пятніцу запрасілі на цікавае мерапрыемства работнікі бібліятэкі. Шмат разнастайнай карыснай інфармацыі са скарбніцы народнай мудрасці даведаліся прысутныя. Пра тое, напрыклад, як ладзіліся шчадроўныя маскарады, якія песні спявалі, як калядоўшчыкаў віталі.**


Вядучыя вечарыны Зоя ДУРЭЙКА і Наталля ЛАЎРАНКОВА.

Фальклорная вечарына адбылася ў чытальнай зале раённай бібліятэкі. У гэты год, што распачаўся пад знакам беларускай кнігі, традыцыйныя калядныя сустрэчы бібліятэчных работнікі вырашылі прысвяціць народным традыцыям. У літаратурна-музычную гасцёўню прыйшлі аматары чытання, сябры бібліятэкі, удзельнікі тэматычных аб'яднанняў.

Жарты-перакрыткі, лічылкі, загадкі, прыказкі і прымаўкі, народныя песні, аповеды пра народныя традыцыі - усё гэта было ў праграме так званых святочных праводзінаў Каляды. Выкладчык школы мастацтваў і кіраўнік узорнага дзіцячага калектыву "Кучарочкі" Алена Захарава расказала пра беларускія песні, а яе выхаванкі выканалі некалькі песень, у тым ліку адну новую, што запісана ў Шутавічах. Весялілі прысутных артысты народнага тэатра "Батлейка" з Залесся. Спяваў вядомы на Смаргоншчыне бард Алег Мізула.

**Ала КЛЕМЯНОК.**

■ МІЖ ВЕЧНЫМ І ЗЯМНЫМ

# І застаецца яна з намі...



*Бяруся зноў за свой аловак*
*І забыццю наперакор*
*Пішу ўспаміны.*
*Няхай хоць у радках нярoўных*
*Імёны вашы ўсплывуць.*
*Жывыя помніць вас павінны,*
*Малітвай светлай памянуць...*

**31 студзеня гэтага года Алене Віктараўне РУДКО было б 70 год. На жаль, няўмольны лёс распарадзіўся па-іншаму, вызначыўшы ёй на гэтым свеце толькі няпоўных 50. Вось такой прыгожай жанчынай, як на гэтай фотакартцы, засталася і жыве яна ў памяці сяброў, таварышаў, калег, сваіх былых вучняў. Кароткае і светлае жыццё было прысвечана людзям.**

Алена Віктараўна працавала настаўніцай роднай мовы і літаратуры ў першай сярэдняй школе нашага горада. Была яна педагогам ад Бога. Яе ўрокі – цікавыя і глыбокія па змесце, эмацыянальныя, кранаді дзіцячыя душы, заставаліся ў памяці. На ўсё жыццё запаміналіся сустрэчы з вядомымі пісьменнікамі, навукоўцамі, якія ладзіла настаўніца. Алена Віктараўна вяла вялікую пазакласную работу, адной з першых арганізавала дзейнасць клуба "Роднае слова". На пасяджэнні клуба прыязджалі Янка Брыль, Уладзімір Някляеў, Фёдар Янкоўскі, кандыдат гістарычных навук Генадзь Каханоўскі, кандыдат філалагічных навук Арсень Ліс, іншыя знакамітыя, паважаныя людзі. Вось як пісалі вучні пра такія сустрэчы:

*"Для нас, вучняў, гэтыя сустрэчы – сапраўднае свята" (Аксана Мейсак).*

*"Я першы раз у сваім жыцці сустракалася з такімі выдатнымі людзьмі. Яшчэ ніколі я не чула такога чыстага вымаўлення нашых беларускіх слоў, як у Фёдара Міхайлавіча Янкоўскага. Пасля сустрэчы я і мая сяброўка дамовіліся размаўляць толькі на роднай мове" (Света Міхновіч).*

*"Хочацца быць дабрэйшай, з большай увагай адносіцца да ўсіх людзей, да сваёй культуры" (Алена Дземянчонак).*

*"Пасля такой сустрэчы нават камень пацяплее, а чалавек узвышаецца маральна і духоўна" (Наташа Лісоўская, прэзідэнт клуба "Роднае слова").*

Доктар філалагічных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі БССР, пісьменнік Фёдар Міхайлавіч Янкоўскі загадваў кафедрай беларускага мовазнаўства педінстытута імя М. Горкага. Алена Віктараўна была ў той час яго лепшай студэнткай. У сямейным архіве мужа Алены Віктараўны беражна захоўваюцца лісты былога выкладчыка да сваёй колішняй студэнткі. Фёдар Міхайлавіч раіў ёй звязаць лёс з навукай, дасылаў настаўніцы свае творы і навуковыя работы. А калі Янкоўскага не стала, яго жонка дзякавала Алену Віктараўну за тую шчырую дружбу і падтрымку, якую знаходзіў прафесар у пісьмах Алены Рудко.

"Дарагая Лена! Мне сумна без Вашых шчырых, харошых, сардэчных лістоў. Калі становіцца вельмі цяжка, думаю пра Вас, пра Вашу адданасць, перачытваю Вашы лісты. Успамінаю, як Фёдар Міхайлавіч заўсёды казаў: "Больш было б такіх людзей, такіх настаўнікаў, як наша Алена, і гучала б шырока і моцна роднае слова".

Сапраўды, была яна настаўніцай па прызванню. І вельмі хацела, каб яе выхаванцы сталі шчырымі беларусамі, любілі сваю краіну, добра ведалі гісторыю.

Кожнае лета Алена Віктараўна арганізоўвала паездкі па знакамітых мясцінах Беларусі. Добра памятаю экскурсію на радзіму Янкі Купалы ў Вязынку. (У той час мы працавалі разам, разам і ў Вязынку паехалі). Прайшліся сцежкамі, па якіх хадзіў некалі паэт, пабывалі ў яго хаце, а потым чыталі вершы. Чыталі і вучні, і Алена Віктараўна. Яна, дарэчы, вельмі многа вершаў ведала напамяць і па-майстэрску ўмела чытаць.

Такія падарожжы-вандроўкі праводзілі мы і ў іншыя гістарычна славутыя мясціны. Пабывалі вучні на радзіме Францішка Багушэвіча ў Кушлянах. Захавальнікам музея-сядзібы быў тады Міхал Ляпеха. Ён і расказваў нам пра жыццё і творчасць паэта-дэмакрата. Прадоўжылася тая экскурсія ў Жупранах. А пазней Алена Віктараўна выдала цікавую працу пра Францішка Багушэвіча. У гэтым дапамог ёй раённы савет Беларускага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры.

А яшчэ Алена Віктараўна часта выступала з цікавымі, актуальнымі матэрыяламі на старонках газет "Светлы шлях", "Літаратура і мастацтва", "Настаўніцкая газета". Яе вельмі хвалявала становішча роднай беларускай мовы і яна старалася рабіць усё, каб матулина мова гучала не толькі на ўроках беларускай літаратуры, а ўсюды: у сям'і, на вуліцы, ва ўстановах, на сходах. Яна рашуча і нястомна змагалася за ўсё беларускае.

А якім цудоўным чалавекам была Алена Віктараўна ў звычайным штодзённым жыцці! Умела сябраваць і цаніць дружбу. Асабліва высакародная роля яе ў жыцці другой настаўніцы Антаніны Матусевіч. Антаніна Аляксандраўна цяжка хварэла, а родных блізка не было. Алена Віктараўна забірала яе ў сваю аднапакаёвую кватэру і месяцамі выходжвала, замяняла такім чынам і сясцёр, і бацькоў. Яна любіла і ўмела прыйсці на дапамогу кожнаму, каму ў гэтым была патрэба. У кватэры Алены Віктараўны заўсёды былі людзі: суседзі, калегі, родныя. Але часцей за ўсё – былыя вучні, якія прыходзілі за добрай парадай ці проста пасядзець і шчыра пагутарыць.

Вясёлая, добразычлівая, улюбёная ў сваю працу, сваіх вучняў... На жаль, няма яе сярод нас, а святло дабрыні ідзе ад яе памяці. Памяць пра высакародных людзей, што пакінулі нас, нязгасным цяпліцца святлом у сэрцах жывых...

**Вольга АНДРУШЧАНКА,**
**ветэран**
**педагагічнай працы.**


## «ГОРЯЧАЯ ЛИНИЯ»

В связи с участившимися фактами нелегальной реализации алкогольной и табачной продукции, ростом преступлений и правонарушений, совершаемых на почве пьянства и наркомании, в дежурной части полка патрульно-постовой службы милиции создана и круглосуточно работает «ГОРЯЧАЯ ЛИНИЯ», позвонив на которую вы можете сообщить фактах самогоноварения, продажи спирта, сигарет.

Анонимность гарантируется. **Тел. в Гродно 797-333.**